ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1988 г.
ЧАЦВЕР
24
САКАВІКА
№ 9 (1567)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Увага: у наступным нумары...

«Зараз нават пад аховай шкляной вітрыны ў акружэнні старых знаёмых пры матавым ласкальным святле лямп Жар-птушка выглядала безабароннай. Прыгажэйшая за іншых, яна імкнулася сарвацца з месца, зашыцца ў кут, хаваючы яркае апярэнне. І не магла».

Пра лёс беларускай Жар-птушкі, імператарскага пінгвіна, гімалайскага мядзведзя вы даведаецеся з матэрыялу

«Часовая праціска»

у наступным нумары.

Беларускі універсітэт

тэлетайп

УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

Сёння

на базе юрыдычнага факультэта пачынаецца рэспубліканская навукова-метадычная канферэнцыя «Актуальныя пытанні ўдасканалення выхаваўчай работы і прафілактыкі правапарушэнняў сярод студэнцтва». На канферэнцыі зробяць даклады пракурор Беларускай ССР Г. С. Тарнаўскі, першы намеснік міністра ўнутраных спраў БССР В. А. Кавалёў, намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР С. А. Малевіч, начальнік Мінскай вышэйшай школы МУС СССР В. М. Савічаў і іншыя.

В. ЦІХІНЯ,
дэкан юрыдычнага факультэта.

ЁСЦЬ ІДЭЯ! ХТО ПАДТРЫМАЕ?

Студэнцкая вясна-88

Традыцыйны конкурс мастацкай самадзейнасці «Студэнцкая вясна» сёлета праводзіцца не будзе. Замест яго,— гаворыць мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба БДУ Маргарыта ТАРАСАВА,— ёсць задумка на ўтварэнне

ДЗЁН УНІВЕРСІТЭТА.

Што гэта, калі, дзе і як?

Універсітэцкія дні — гэта перш за ўсё свята. Свята, на якім можна добра адпачыць, гэта, калі жадаеце, выпадак для знаёмстваў паміж сабой студэнтаў розных факультэтаў. Свята будзе ўдачлівым, калі дапаможа рабятам з'яднацца, лепш даведацца адзін пра аднаго, здружыцца.

Мяркуем, самым падыходзячым часам для святкавання з'явіцца цёплыя, прыгожыя дні: зразумела, субота і нядзеля, напрыклад, 21—22 МАЯ.

Што будзе ўяўляць сабой свята канкрэтна? Пакуль ёсць толькі наметкі. Прапануем іх вашай увазе.

Збор ва універсітэцкім гарадку. Мітынг. Выезд у зялёную зону. Разбіўка палаточнага гарадка. Адкрыццё з прывітальным словам рэктара Л. І. Кісялеўскага. Спартыўныя спаборніцтвы, гульні, конкурсы. Удзельнікі мастацкай самадзейнасці рыхтуюцца да фестывальнага канцэрта. Увечары канцэрт. Пасля якога — дыскатэка. Песні ля вогнішча. Дыскатэка працягнецца, колькі вытрымаюць апаратура і Вашы ногі. Ад'езд апоўдні наступнага дня.

Колькасны ўдзел — каля тысячы чалавек, гэта ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці і жадаючыя ад факультэтаў.

Аднак, паўтараем, гэта пакуль толькі папярэднія наметкі на паперы. ЯК ПРОЙДУЦЬ ДНІ, якімі падзеямі яны будуць насычаны, нават іх характар, ВЫЗНАЧАЦЬ самім удзельнікам свята, гэта значыць ВАМ, паважаныя нашы студэнты. Мы не чакаем ад вас дасканала распрацаваных сцэнарыяў (пра гэта толькі марым). Аднак нам ВЕЛЬМІ ПАТРЭБНЫ ЛЮБЫЯ вашы прапановы, якія дапамогуць стварыць фрагменты Дзён, спалучыць іх у сапраўднае студэнцкае свята.

Неабходна спыніцца на важнай акалічнасці — месцы правядзення Дзён. Мо ёсць рацыя, каб яны адбыліся не ў зялёнай прыгараднай зоне, а ў межах горада (напрыклад, у парку Горкага) ці ў межах універсітэцкага гарадка?

Калі ж адыходзіць ад таго, што Дні будуць праведзены за горадам, неабходна ўлічваць, што для гэтага трэба: блізкі вадаём, радыёфікаваная і асвечаная, адкрытая пляцоўка, вогнішча. І, пажадана, каб месца было маляўнічым.

Вашых парад, думак, заўваг чакаюць у студэнцкім клубе (галоўны корпус, 401 пакой, тэлефон 20-42-07) і ў рэдакцыі «БУ» (адрас і тэлефон на апошняй старонцы).

Увага. «Студэнцкая вясна-88» не за гарамі. За прагнозамі сачыце па публікацыях у вашай газеце.

ПАРА Ў ШЛЯХ ДАРОГУ

— Раблю выгляд, што бачу вас ўпершыню,— тут дэкан хімічнага факультэта В. Ф. Цікавы робіць паўзу і абводзіць смяшлівымі і адначасова сумнымі вачыма тых, да каго звяртаецца. На жаль, можа быць наадварот, і сустрэча гэта — апошняя.— Пытаюся, куды вы хочаце, вы называеце, распісваецеся. Усё зразумела?

Што ж тут не зразумець? Для некаторых сённяшняя падзея — звычайная фармальнасць, бо будучае назначэнне вызначылася напярэдадні. Для другіх — нечаканы, а можа нежаданы і таму не вельмі прыемны паварот у жыцці, і фармальнасць тут ужо раўняецца амаль прысуду адлучэння ад родных, сяброў, гарадскога жыцця і камфорту. Для трэціх — апошняя надзея на шчаслівы выпадак, які дасць падставу ўяўляць будучае ў больш маляўнічых фарбах. Бо ўсім без выключэння зразумела адно — будучая праца, дзеля якой, урэшце, і пераадольвалі 5 прыступак Alma Mater, яна той стрыжань, на якім трымаецца лёс.

Таму хоць і здаюцца на першы погляд дзяўчаты педагагічнага і вытворчага патокаў хімічнага факультэта радаснымі, нават бестурботнымі, быццам 1 верасня 1983 года, тоячца за гэтай лёгкасцю трывога і роздум, ваганні і чаканне.

Яшчэ ёсць час: пустуюць у дадатку да дыплома клетачкі для дзяржэкзаменаў і абароны дыпломнай работы. Яшчэ ёсць час супакоіцца, прыйсці у сябе, зноў паверыць ва ўласныя сілы і ў тое, што жыццё абавязкова будзе насычаным і паўнацэнным, дзе б ты ні працаваў. Яшчэ ёсць час зразумець: будучая праца — той жа экзамен на сталасць. І здаць яго «на выдатна» — твой абавязак.

Фота і тэкст
С. ПЛЫТКЕВІЧА.

РАЗМЕРКАВАННЕ

НА МОВЕ ДРУЖБЫ

КОЖНАЙ вясной па традыцыі ў Белдзяржуніверсітэце праводзіцца тыдзень савецка-балгарскай дружбы. Удзел у ім вучоных і студэнтаў, навуковыя канферэнцыі, выстаўкі, сустрэчы, вечары дружбы сталі неад'емнымі прыкметамі тыдня. А спалучэнне юбілейных дат надае яму асаблівую значнасць. У пачатку сакавіка балгарскі народ адзначыў 110-ю гадавіну вызвалення ад турэцкага рабства. Ёсць і яшчэ адна знамянальная дата — 40-годдзе падпісання савецка-балгарскага дагавора аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе.

МАСТЫ ПРАЗ СТАГОДДЗІ

У СТАЛІЦЫ Беларусі вучыцца больш за пяцьдзесят грамадзян НРБ, у тым ліку і ў БДУ імя У. І. Леніна. Члены балгарскага зямляцтва чакалі святкавання тыдня дружбы з асаблівым нецярпеннем. Для іх гэта вельмі дарагое, блізкае. Таму з такім захапленнем слухалі яны разам з савецкімі сябрамі гутаркі, лекцыі, даклады, прысвечаныя савецка-балгарскім адносінам, глядзелі мастацкія і дакументальныя фільмы пра Балгарыю.

Не з меншай цікавасцю ўспрынялі прысутныя і выступленне доктара гістарычных навук, прафесара Д. Б. Мельцара «Мае сустрэчы з Балгарыяй».

Хвалюючыя абодва бакі пытанні, якія датычаць мовы, літаратуры, навукі, культуры, былі абмеркаваны на III універсітэцкай навуковай канферэнцыі па балгарыстыцы, у якой прынялі актыўны ўдзел беларускія і балгарскія вучоныя. Кожны ўдзельнік мог выбраць секцыю, як кажуць, па густу. Іх працавала тры: гістарычная, лінгвістычная і літаратуразнаўчая. Прайшла і XIV савецка-балгарская студэнцкая навуковая канферэнцыя.

Завяршыўся тыдзень вечарам дружбы. Багацце фальклору, разнастайнасць нацыянальных касцюмаў, меладычнасць і своеасаблівасць народных песень — усё гэта прадэманстравалі балгарскія студэнты. У праграме прагучалі таксама пераклады вершаў Марыны Абрагімовіч і Святланы Махоцінай, песні на балгарскай мове ў выкананні студэнтаў філфака. Выкладчык балгарскай мовы Георгі Гырдзеў уручыў ганаровыя дыпломы і медалі людзям мастацтва, якія заслужылі іх сваім укладам у развіццё савецка-балгарскіх сувязей.

Прайшоў тыдзень дружбы. Але ў аўдыторыях па-ранейшаму чуецца руская, беларуская, балгарская мова. І часта патрэбы ў перакладзе няма. Усё зразумела і так, бо карані дружбы трох братніх народаў — не толькі ў моўнай блізкасці. У гісторыі гэтай дружбы ёсць старонкі, якія ўпісваюцца савецкім і балгарскім народамі сёння. Адной з запамінальных, спадзяёмся, стане і сакавіцкі тыдзень дружбы ў Беларускім універсітэце.

Красімір ІВАНАЎ,
аспірант факультэта журналістыкі.

НА ВУЧОБУ ЗАПРАШАЕ

— Не можа быць! Ты ўжо на дыпломе!? — здзіўлена акругляюць вочы знаёмыя, з якімі не бачылася ўжо сто гадоў.

Што і казаць, хутка праляцелі гады вучобы ва універсітэце і для мяне. Здаецца, толькі нядаўна быў развітальны школьны баль, а вось цяпер зноў трэба думаць пра святочную сукенку...

Ці шкадавала хоць аднойчы, што зрабіла такі выбар? Хутчэй, радавалася, што не памылілася. Шэсць гадоў не прайшлі непрыкметна. Яны падарылі цікавую работу па абранай спецыяльнасці, прывычку працаваць самастойна, уменне мабілізаваць сябе ў час сесіі, які раўназначны экстрэмальнай сітуацыі, сяброўства і шчырыя кантакты з калегамі, якія, веру, будуць працягвацца і ў будучым, і, як гэта ні дзіўна, шмат вольнага часу.

А што хачу сказаць таму, хто трымае газету і вагаецца? Трэба ўсё-такі ўзважыць сваё рашэнне як мага дакладней, параіцца з тымі, хто вучыцца як на дзённым, так і на завочным, завітаць, калі ёсць магчымасць, на завочны факультэт і яшчэ падумаць, якім ты зможаш стаць студэнтам, з чым прыйдзеш на факультэт і што пасля цябе застанецца...

А. ВІХРОВА,
выпускніца завочнага
факультэта, аддзяленне
журналістыкі.

***БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА** — вядучая ВНУ рэспублікі і краіны. У кастрычніку 1988 года універсітэту споўніцца 67 гадоў. За гэты час універсітэт вырас як колькасна, так і якасна. Пачынаючы сваю работу з двух факультэтаў — медыцынскага і грамадскіх навук з кантынгентам 1390 студэнтаў,— універсітэт вырас да 12 факультэтаў, на якіх зараз навучаецца больш як 14 тысяч студэнтаў.*

***ЗАВОЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ** з'яўляецца адным са старэйшых і шматколькасных. У 1985 годзе факультэт адзначыў свой паўвекавы юбілей. Сёння на яго васьмі аддзяленнях, якія дзейнічаюць на базе асноўных факультэтаў, займаецца звыш чатырох тысяч чалавек. Штогод завочны факультэт выпускае каля 700 спецыялістаў. Выпускнікі факультэта ўкараняюць атрыманыя імі ва універсітэце веды ў многіх вучэбных, навуковых установах, на прадпрыемствах рэспублікі і краіны. Многія з іх сталі заслужанымі настаўнікамі, вядомымі вучонымі, партыйнымі і дзяржаўнымі дзеячамі.*

На завочным факультэце павышае сваю кваліфікацыю вялікі атрад педагагічных кадраў школ, сярэдніх спецыяльных навучальных установ, прафесійных вучылішчаў. Вучэбную работу з гэтай катэгорыяй студэнтаў-завочнікаў кафедры будуюць, зыходзячы з рэформы вышэйшай, агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы. З вялікай цікавасцю праблемы сучаснай школы абмяркоўваюцца студэнтамі-завочнікамі на навуковых канферэнцыях.

У падрыхтоўцы спецыялістаў па завочнай форме навучання ў БДУ імя У. І. Леніна прымаюць удзел каля 80 універсітэцкіх кафедраў. Дзякуючы гэтаму вучэбную работу забяспечвае высокакваліфікаваны прафесарска-выкладчыцкі калектыў, у саставе якога каля 40 дактараў навук, прафесараў і каля 300 кандыдатаў навук і дацэнтаў.

Вядучыя прафесары, дацэнты дзеляцца сваім вопытам і ведамі па актуальных пытаннях юрыспрудэнцыі, журналісцкага майстэрства і іншых хвалюючых сучаснага спецыяліста праблемах.

Студэнты-завочнікі атрымліваюць тую ж спецыяльнасць, што і выпускнікі дзённай і вячэрняй форм навучання, і працуюць у самых розных галінах народнай гаспадаркі, навукі і культуры нашай рэспублікі.

Спецыфіка завочнага навучання заключаецца ў тым, што асноўны цяжар у падрыхтоўцы спецыяліста ляжыць на самастойнай рабоце студэнта. Установачна-экзаменацыйныя сесіі з'яўляюцца непрацяглымі: 30 каляндарных дзён на I, II курсах і 40 на ўсіх наступных. Увесь астатні час студэнт-завочнік працуе над вучэбным матэрыялам самастойна. Але і ў міжсесійны перыяд студэнт не застаецца адзін у сваёй вучэбнай дзейнасці. Правільна арганізаваць самастойную работу па вывучэнню кожнай дысцыпліны яму дапамагаюць дэканат і кафедры. Студэнт забяспечваецца графікам самастойнай работы, вучэбна-метадычнай літаратурай па кожнай дысцыпліне. Па суботах на працягу года праводзяцца «дні завочніка». У гэтыя дні ён можа атрымаць кансультацыю па любому пытанню вучэбнай дысцыпліны, паслухаць лекцыю, здаць залік, экзамен.

Вялікую дапамогу студэнтам-завочнікам у іх самастойнай рабоце аказваюць бібліятэка універсітэта і вучэбна-метадычны кабінет завочнага факультэта, якія забяспечваюць студэнтаў вучэбнымі праграмамі, метадычнымі дапаможнікамі, вучэбнай літаратурай.

Партыя і ўрад праяўляюць пастаянны клопат аб працоўнай моладзі, якая імкнецца павысіць сваю кваліфікацыю без адрыву ад вытворчасці. Пастановай Савета Міністраў СССР ад 24 снежня 1982 года студэнтам, якія займаюцца без адрыву ад вытворчасці, прадастаўляюцца ільготы, каб забяспечыць іх паспяховае навучанне.

Творчая работа кафедраў, сістэматычная самастойная работа студэнтаў, наяўнасць ільгот у агульным спалучэнні прыводзяць да таго, што кожны пяты студэнт-завочнік вучыцца на «добра» і «выдатна», а некаторыя заканчваюць універсітэт з выдатным дыпломам.

Паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на аснове інтэнсіфікацыі грамадскай вытворчасці вызначае новыя патрабаванні да якасці падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, і ў першую чаргу — у сістэме вячэрняй і завочнай форм адукацыі. Рашэнне гэтай задачы ажыццяўляецца на аснове ўдасканалення ўсіх звенняў вучэбна-выхаваўчага працэсу, пошуку новых шляхоў і спосабаў яго інтэнсіфікацыі ў святле Асноўных напрамкаў перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Абітурыент-88! Завочны факультэт Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна адчыняе перад табою дзверы ўсіх аддзяленняў, жадае табе з поспехам вытрымаць уступныя экзамены і стаць на шасцігадовы, але цікавы шлях узыходжання да глыбокіх і трывалых ведаў, неабходных сучаснаму спецыялісту.

Сардэчна запрашаем на завочны факультэт!

Г. МАЦВЕЕЎ,
дэкан завочнага
факультэта.

МАТЭМАТЫКА

У 1985 годзе адкрыўся набор на аддзяленне матэматыкі завочнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. Аддзяленне рахтуе кваліфікаваныя кадры для работы, звязанай з выкарыстаннем матэматыкі і ЭВМ у акадэмічных, навукова-даследчых і галіновых інстытутах, праектных і планава-эканамічных арганізацыях, вылічальных цэнтрах, заводскіх лабараторыях, а таксама выкладчыкаў сярэдніх школ, вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. У адпаведнасці з вучэбным планам выпускнікі аддзялення матэматыкі атрымліваюць фундаментальныя веды ў самых розных галінах тэарэтычнай і прыкладной матэматыкі, вывучаюць праграмаванне і метады вылічэнняў, авалодваюць неабходнымі навыкамі работы на вылічальных машынах.

З верасня 1986 года падрыхтоўка спецыялістаў-матэматыкаў вядзецца на двух патоках: навукова-вытворчым і навукова-педагагічным. Конкурс паступаючых на кожнае аддзяленне з 1987 года праводзіцца паасобна.

На навукова-вытворчым патоку робіцца акцэнт на навучанне пастаноўцы і рашэнню розных матэматычных задач. Студэнты навукова-педагагічнага патоку вывучаюць дысцыпліны псіхолага-педагагічнага характару і методыку выкладання матэматыкі.

Навучанне на аддзяленні матэматыкі заканчваецца здачай дзяржаўнага экзамена па навуковаму камунізму і абаронай дыпломнай работы.

Вучэбны працэс на аддзяленні матэматыкі ажыццяўляюць сем кафедраў: вышэйшай алгебры; геаметрыі і тапалогіі; тэорыі функцый; функцыянальнага аналізу; дыферэнцыяльных ураўненняў; ураўненняў матэматычнай фізікі; лічбавых метадаў і праграміравання.

Выпускнікі аддзялення матэматыкі — навукова-вытворчага патоку — змогуць працаваць у акадэмічных, навукова-даследчых і галіновых інстытутах, праектных і планава-эканамічных арганізацыях, вылічальных цэнтрах і лабараторыях, у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Выпускнікі навукова-педагагічнага патоку змогуць працаваць у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, а таксама ў агульнаадукацыйных школах.

ПРАВАЗНАЎСТВА



Падрыхтоўка спецыялістаў-правазнаўцаў ажыццяўляецца па трох напрамках: дзяржаўна-прававому, гаспадарча-прававому і судова-пракурорска-следчаму.

Выпускнікі аддзялення працуюць у выканкомах Саветаў народных дэпутатаў, у міністэрствах, ведамствах, на вытворчых аб'яднаннях, прадпрыемствах, ва ўстановах, у органах юстыцыі, пракуратуры, міліцыі.

ДЗЯРЖАЎНА-ПРАВАВАЯ. Гэта спецыялізацыя дае студэнтам глыбокую падрыхтоўку для работы ў партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных і іншых грамадскіх арганізацыях, у выканкомах Саветаў народных дэпутатаў, а таксама ў апаратах міністэрстваў, ведамстваў, іншых органах дзяржаўнай улады і кіравання.

ГАСПАДАРЧА-ПРАВАВАЯ. Выпускнікі гэтай спецыялізацыі працуюць юрыстамі ў народнай гаспадарцы ў якасці начальнікаў аддзелаў міністэрстваў і ведамстваў, вытворчых аб'яднанняў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, а таксама юрысконсультамі.

СУДОВА-ПРАКУРОРСКА-СЛЕДЧАЯ. Па гэтай спецыялізацыі вядзецца падрыхтоўка суддзяў, пракуроraў, следчых, адвакатаў, натарыусаў, работнікаў апарату абласных аддзелаў юстыцыі, органаў Міністэрства ўнутраных спраў.

Лепшыя студэнты — выпускнікі факультэта — маюць магчымасць паступіць у аспірантуру. Значная частка прафесарска-выкладчыцкага саставу факультэта — былыя выпускнікі.

Вучоныя факультэта прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы многіх законаў Беларускай ССР. Яны былі ўключаны ў рабочыя групы па падрыхтоўцы крымінальнага, крымінальна-працэсуальнага, грамадзянскага, грамадзянска - працэсуальнага, працоўнага і іншых кодэксаў. Да навукова-даследчай работы па падрыхтоўцы праектаў заканадаўчых актаў прыцягваюцца студэнты. У іх ёсць магчымасць працаваць і па тэарэтычных праблемах дзяржавы і права.

На кафедрах факультэта працуюць навуковыя студэнцкія гурткі.

У працэсе вучобы студэнты праходзяць і вытворчую практыку ў народных судах, пракуратуры, следчых органах, юрыдычных аддзелах прадпрыемстваў і ўстаноў. Заканчваецца вучоба абаронай дыпломнай работы і здачай дзяржаўных экзаменаў.

ГІСТОРЫЯ



Гістарычны факультэт быў адкрыты ў верасні 1934 года. Ён рыхтуе гісторыкаў, выкладчыкаў гісторыі і грамадазнаўства. Выпускнікі факультэта працуюць настаўнікамі, выкладчыкамі прафесійна-тэхнічных вучылішчаў і тэхнікумаў, супрацоўнікамі музеяў, архіваў і экскурсійных бюро. Многія з іх актыўна працуюць у саставе партыйных і камсамольскіх органаў.

Студэнт-гісторык атрымлівае шырокую гуманітарную адукацыю і глыбокую ідэйна-тэарэтычную падрыхтоўку, а таксама фундаментальныя веды па сацыяльных дысцыплінах.

На факультэце ўдзяляецца вялікая ўвага рабоце са студэнтамі-завочнікамі. Для іх чытаюць лекцыі такія вядомыя вучоныя, як прафесары У. Р. Івашын, У. С. Багданаў, Э. М. Загарульскі, І. О. Царук, А. П. Ігнаценка, Л. М. Шнеерсон, В. В. Чапко, Д. Б. Мельцар і іншыя. Многія з іх з'яўляюцца выпускнікамі гістарычнага факультэта.

Многія былыя студэнты гістфака займаюць зараз высокія і адказныя пасады. Ёсць сярод выпускнікоў дырэктары НДІ, рэктары ВНУ, дэканы, загадчыкі кафедраў грамадскіх навук, адказныя работнікі партыйнага і савецкага апарату.

Студэнты-гісторыкі маюць магчымасць спецыялізавацца па гісторыі СССР, гісторыі БССР, гісторыі КПСС, усеагульнай гісторыі, археалогіі і этнаграфіі, гісторыі рэлігіі і атэізму.

Кафедры факультэта аказваюць дапамогу настаўнікам сярэдніх школ рэспублікі ў паляпшэнні выкладання гісторыі, выдаюць дапаможнікі і метадычныя распрацоўкі для школ, вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. На факультэце ёсць музей, які складаецца з аддзелаў археалогіі, этнаграфіі, Старажытнага Усходу, антычнага мастацтва, нумізматыкі і манетных кладаў. У 1977 годзе створаны музей універсітэта.

Факультэт падтрымлівае трывалыя сувязі з Сафійскім (НРБ) і Йенскім (ГДР) універсітэтамі. Кожны год студэнты факультэта праходзяць практыку ў ГДР, знаёмяцца з гісторыяй і культурай гэтай братняй краіны. У сваю чаргу студэнты з Балгарыі, ГДР, Польшчы — частыя госці на факультэце.

ЗАВОЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

ФІЛАЛОГІЯ

Хто любіць родную мову і літаратуру, хто жадае быць выкладчыкам беларускай і рускай мовы і літаратуры ці выкладчыкам рускай мовы і літаратуры, той запрашаецца на аддзяленне беларускай і рускай мовы і літаратуры і рускай мовы і літаратуры.

Адзін са старэйшых і буйнейшых ва універсітэце філалагічны факультэт мае багатыя і слаўныя традыцыі ў вучобе і выхаванні творчай моладзі. Яны звязаны з навукова-педагагічнай работай на факультэце вядомых вучоных і пісьменнікаў — народнага пісьменніка Беларусі Якуба Коласа, акадэміка АН БССР І. І. Замоціна, прафесараў Е. І. Барычэўскага, А. Н. Вазнясенскага, М. Н. Піятуховіча, П. А. Бузука і іншых, якія шмат зрабілі для развіцця лінгвістычнай і літаратуразнаўчай навукі БССР, для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў для народнай адукацыі, навуковых і культурных установ рэспублікі. Гэтыя традыцыі захоўваюць і памнажаюць прафесарска-выкладчыцкі калектыў факультэта, у саставе якога сёння налічваецца 125 чалавек. Сярод іх вядомыя пісьменнікі, паэты, крытыкі, члены Саюза пісьменнікаў СССР і БССР: прафесары Н. С. Гілевіч, А. А. Лойка, П. І. Ткачоў, А. Я. Супрун, Л. М. Шакун, П. П. Шуба, І. П. Кахно, Н. Б. Мячкоўская, А. Б. Плотнікаў, дацэнты Д. Я. Бугаёў, В. В. Казлова, В. П. Рагойша, М. Б. Яфімава і іншыя.

Завочную форму навучання абслугоўваюць сем кафедраў: беларускай мовы, беларускай літаратуры, рускай мовы, рускай класічнай літаратуры, рускай савецкай літаратуры, агульнага і славянскага мовазнаўства, замежнай літаратуры.

Вучэбна-выхаваўчы працэс вядуць тыя ж выкладчыкі, якія дапамагаюць студэнтам-завочнікам набыць устойлівыя і трывалыя веды па вывучаемых прадметах, авалодаць методыкай выкладання мовы і літаратуры, а таксама набыць навыкі самастойнай навукова-даследчай работы.

Студэнты-завочнікі вывучаюць тыя ж дысцыпліны вучэбнага плана, у тым жа аб'ёме, што і студэнты стацыянара. Вучэбны працэс на завочным факультэце адрозніваецца ад стацыянарнага тым, што ён дзеліцца на дзве вучэбна-экзаменацыйныя сесіі (зімовую і летнюю) і перыяд міжсесійнай самастойнай работы студэнтаў.

Значнае месца ў вучэбным плане студэнтаў-завочнікаў адводзіцца прафесійнай падрыхтоўцы будучых спецыялістаў. Таму яны павінны валодаць глыбокімі ведамі па сучаснай беларускай і рускай мовах, гісторыі беларускай і рускай літаратур, методыцы іх выкладання, стараславянскай мове, культуры мовы, рускай і беларускай дыялекталогіі, фальклору, тэорыі літаратуры, агульнаму мовазнаўству і інш.

Вялікае значэнне надаецца на факультэце вывучэнню грамадскіх дысцыплін, якія фарміруюць у студэнта марксісцка-ленінскі светапогляд і выхоўваюць актыўную жыццёвую пазіцыю. Гэта такія дысцыпліны, як гісторыя КПСС, навуковы камунізм, гісторыя СССР і БССР, марксісцка-ленінская філасофія і г. д. Акрамя гэтага студэнты вывучаюць лацінскую мову, а таксама адну з замежных (англійскую, нямецкую, французскую, іспанскую), літаратуру народаў СССР і замежную літаратуру (літаратуру краін Еўропы, Азіі і Амерыкі), шэраг дысцыплін па спецыялізацыі, праходзяць вучэбна-педагагічную практыку.

Студэнтам-завочнікам чытаюцца лекцыі, праводзяцца практычныя і семінарскія заняткі. Вучонымі факультэта напісана шмат падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, метадычных распрацовак для студэнтаў-завочнікаў.

Шматгадовая практыка сведчыць аб тым, што студэнты завочнай формы навучання з'яўляюцца высокакваліфікаванымі спецыялістамі-філолагамі, якія з гонарам нясуць высокае званне настаўніка. Многія з выпускнікоў-завочнікаў сталі вядомымі вучонымі, дзеячамі культуры, пісьменнікамі.

ГЕАГРАФІЯ

Геаграфічны факультэт — вядучы цэнтр падрыхтоўкі кадраў для навукова-даследчай і вучэбна-метадычнай работы па геаграфіі ў Беларусі. Геаграфічная адукацыя ва універсітэце вызначаецца шырокім дыяпазонам ведаў. Таму выпускнікоў факультэта можна сустрэць у школах, навукова-даследчых, праектных і вытворчых установах, арганізацыях прыродазнаўчага, эканамічнага і краязнаўчага профілю.

На факультэце два аддзяленні: дзённае і завочнае. У саставе факультэта сем кафедраў і дзве лабараторыі: праблемная навукова-даследчая меліярацыі ландшафтаў і галіновая навукова-даследчая возеразнаўства.

Студэнты завочнага факультэта атрымліваюць спецыяльнасці: фізічная ці эканамічная геаграфія. Студэнты-завочнікі, таксама як і студэнты дзённага аддзялення, вывучаюць грамадскія і агульнаадукацыйныя дысцыпліны, шырокае кола геаграфічных навук. Усе студэнты слухаюць лекцыі па агульнай геалогіі, глебазнаўству і геаграфіі глеб, метэаралогіі і кліматалогіі, гідралогіі, біягеаграфіі, тапаграфіі і картаграфіі, фізічнай і эканамічнай геаграфіі СССР, фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў, эканамічнай геаграфіі замежных краін, геаграфіі БССР, гісторыі і метадалогіі геаграфічнай навукі і іншыя.

Акрамя таго, фізіка-географы вывучаюць геалогію і карысныя выкапні СССР, геаграфію чацвярцічных адкладанняў, ландшафтазнаўства, праблемы фізічнай геаграфіі СССР і іншыя спецыяльныя дысцыпліны. У ліку спецкурсаў, якія чытаюцца для эканоміка-географаў,— эканамічнае раяніраванне, статыстыка, геаграфія транспарту, школьны турызм і краязнаўства.

Важным відам вучэбнай дзейнасці па падрыхтоўцы спецыялістаў-географаў з'яўляюцца вучэбная і вытворчая практыкі. Сіламі выкладчыкаў і студэнтаў факультэта створана вучэбная геаграфічная станцыя «Заходняя Бярэзіна» — месца праходжання ўсіх відаў вучэбнай практыкі. Тут ёсць тры карпусы інтэрнатаў, вучэбныя пакоі, клуб, сталовая, спартыўная пляцоўка, лабараторыі. У час вучэбных практык студэнты праводзяць тапаграфічныя здымкі мясцовасці, вывучаюць геалагічныя працэсы, глебу, вызначаюць форму і памеры ўзвышшаў, нізін, іх прыроду, вядуць назіранні за прыродай.

Вытворчая практыка студэнтаў-завочнікаў звязваецца, як правіла, з месцам і характарам іх работы. Па матэрыялах вытворчай практыкі пішуцца курсавыя і дыпломныя работы.

Як і студэнты дзённай формы навучання, завочнікі прымаюць удзел у навукова-даследчай рабоце, выступаюць з навуковымі паведамленнямі і дакладамі на пасяджэннях гурткоў, канферэнцыях, падаюць работы на рэспубліканскі агляд-конкурс.

БІЯЛОГІЯ

Біялагічны факультэт з'яўляецца старэйшым і буйнейшым цэнтрам у рэспубліцы па падрыхтоўцы біёлагаў. Па гэтай спецыяльнасці падрыхтоўка вядзецца на дзённым і завочным аддзяленнях. Выпускнікам прысвойваецца кваліфікацыя «біёлаг, выкладчык біялогіі і хіміі».

Агульнанавуковая падрыхтоўка на факультэце ажыццяўляецца пры дапамозе вывучэння цыкла грамадскіх дысцыплін, замежнай мовы, вышэйшай матэматыкі, фізікі,неарганічнай,арганічнай, аналітычнай, фізічнай і калоіднай хіміі, варыяцыйнай статыстыкі. Студэнты вывучаюць таксама педагогіку, псіхалогію, методыку выкладання біялогіі і хіміі, праводзяць педагагічную практыку ў сярэдняй школе.

Агульнапрафесійная падрыхтоўка пачынаецца з першага курса і забяспечваецца вывучэннем уводзін у спецыяльнасць, заалогіі беспазваночных і пазваночных, анатоміі, марфалогіі, сістэматыкі раслін, мікрабіялогіі, фізіялогіі раслін, фізіялогіі чалавека і жывёл, біяфізікі, біяхіміі, гісталогіі, генетыкі, дарвінізму.

На гэтай аснове вядзецца спецыялізацыя студэнтаў па адной з сучасных галін біялогіі, батаніцы, заалогіі, мікрабіялогіі, біяхіміі. Студэнты праходзяць вытворчую практыку ў лабараторыях кафедраў, экспедыцыях, інстытутах Акадэміі навук БССР і іншых навуковых установах, на прамысловых прадпрыемствах.

На факультэце працуе сем кафедраў, комплексная праблемная лабараторыя эксперыментальнай біялогіі, лабараторыя фотасінтэзу (пры кафедры фізіялогіі раслін), біялагічная станцыя на возеры Нарач, вучэбна-доследная гаспадарка «Шчамысліца», батанічны сад, заалагічны музей. Вучэбны працэс забяспечваюць 28 вучэбных і навукова-даследчых лабараторый і кабінетаў.

Вучэбны працэс на факультэце вядуць больш за 40 дактароў і кандыдатаў біялагічных навук, а таксама супрацоўнікі біялагічных інстытутаў Акадэміі навук БССР.

Выпускнікі факультэта накіроўваюцца на работу ў якасці настаўнікаў сярэдніх школ, выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і ВНУ, ва ўстановы сістэмы Дзяржаўнага камітэта па ахове прыроды, дзяржаўныя запаведнікі, на прамысловыя прадпрыемствы, а студэнты, якія выявілі здольнасці да навукова-даследчай работы,— ва ўстановы Акадэміі навук БССР, а таксама ў навукова-даследчыя інстытуты Міністэрства аховы здароўя.

ЖУРНАЛІСТЫКА



Факультэт журналістыкі быў створаны ў 1944 годзе ў адпаведнасці з пастановай ЦК ВКП (б) «Аб бліжэйшых задачах партыйных арганізацый КП(б) Беларусі ў галіне масава-палітычнай і культурна-асветніцкай работы сярод насельніцтва». Утварэнне факультэта ў гады Вялікай Айчыннай вайны — яшчэ адно сведчанне клопату партыі пра наш друк. Факультэт журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна такім чынам з'явіўся роданачальнікам у падрыхтоўцы кадраў для друку ва універсітэтах нашай краіны.

Аддзяленне журналістыкі завочнага факультэта рыхтуе работнікаў сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды — газет, часопісаў, радыё і тэлебачання.

За час навучання факультэт падрыхтаваў па стацыянарнай, вячэрняй і завочнай формах навучання больш як 3000 высокакваліфікаваных журналістаў. Многія яго выпускнікі сталі вядомымі партыйнымі, савецкімі, камсамольскімі работнікамі, грамадскімі дзеячамі, вучонымі. Сёння няма практычна ніводнага раёна, дзе б не працавалі нашы выпускнікі, а многія працуюць за межамі Беларусі.

З кожным годам факультэт набірае сілу. Расце колькасць выкладчыкаў, павышаецца іх кваліфікацыя. Умацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база. Асабліва гэта відавочна пасля пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў». Калі ў пяцідзесятых гадах на факультэце дзейнічала толькі адна кафедра, то зараз іх пяць: гісторыі журналістыкі, тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, тэлебачання і радыёвяшчання, зарубежнай журналістыкі і літаратуры. Кафедры ўзначальваюць прафесары і дацэнты. Сёння на факультэце працуюць 39 выкладчыкаў, з іх 6 дактараў навук і 16 дацэнтаў. Сярод іх доктары навук Р. В. Булацкі, Е. Л. Бондарава, А. І. Наркевіч, І. І. Сачанка, Б. В. Стральцоў, М. Я. Цікоцкі.

У адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў» на факультэце больш глыбока вывучаюцца грамадска-палітычныя, агульнаадукацыйныя і спецыяльныя дысцыпліны: тэорыя марксізму-ленінізму, гісторыя КПСС, унутраная і знешняя палітыка партыі і ўрада, савецкае права, тэорыя і практыка буржуазнай журналістыкі, метады ідэалагічнай работы, сацыяльная псіхалогія. Па універсітэцкай праграме студэнты вывучаюць беларускую, рускую, замежную мову і літаратуру, практычную стылістыку і рэдагаванне, гісторыю рускай, беларускай, партыйна-савецкай, замежнай камуністычнай і рабочай журналістыкі, тэорыю і практыку тэлебачання і радыёвяшчання, тэхніку газетнай справы, журналісцкае майстэрства.

Факультэт журналістыкі рыхтуе кадры не толькі для рэспублікі, але і для больш чым 48 краін, якія развіваюцца.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца падрыхтоўцы журналісцкіх кадраў па эканамічных пытаннях. Таму ўводзяцца новыя курсы па вывучэнню актуальных праблем сацыялістычнай эканомікі, навукова-тэхнічнаму прагрэсу, аналізу гаспадарчай дзейнасці прадпрыемстваў, арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, комплекснай праграме ідэйнага выхавання і інш. Студэнты факультэта выпускаюць сваю вучэбную газету «Журналіст» і альманах «Творчасць журналіста», актыўна ўдзельнічаюць у выпуску шматтыражкі «Беларускі універсітэт», працуюць у гуртках студэнцкага навуковага таварыства. Шмат цікавага даюць ім сустрэчы са старэйшымі калегамі па пяру, вучонымі, пісьменнікамі, артыстамі, рэжысёрамі.

АГЛЯДНУЮ НЕАБХОДНА

ШТО НАС ТУРБУЕ? НАС — УНІВЕРСІТЭЦКАЕ ДОБРААХВОТНАЕ ТАВАРЫСТВА БАРАЦЬБЫ ЗА ЦВЯРОЗАСЦЬ.

ПЕРШ ЗА ЎСЁ ТРЭБА СКАЗАЦЬ, БАРАЦЬБА ЗА РАЗУМНЫ, ЦВЯРОЗЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ Ў БДУ ПАВІННА БЫЦЬ ЗАДАЧАЙ І МЭТАЙ НЕ ТОЛЬКІ НАШАГА ТАВАРЫСТВА, А І ХВАЛЮЮЧЫМ ПЫТАННЕМ ДЛЯ ЎСІХ ГРАМАДСКА СВЯДОМЫХ ЧЛЕНАЎ УНІВЕРСІТЭТА. БО БАРАЦЬБА ГЭТА ЖОРСТКАЯ, СУР'ЁЗНАЯ, У ЯКОЙ МЫ НЕ МАЕМ ПРАВА ПРАЙГРАЦЬ. ЯК ВЯДЗЕЦЦА ЯНА КАНКРЭТНА НА СПРАВЕ?

З ТРЫЦЦАЦІ двух прафсаюзных падраздзяленняў на сённяшні дзень маюць свае пярвічныя фарміраванні дваццаць чатыры — гэта ўсе факультэты, уключаючы падрыхтоўчы, усе важнейшыя структурныя падраздзяленні БДУ. Не створаны такія «пярвічкі» яшчэ толькі ў дробных падраздзяленнях: прафілакторыі, друкарні, бібліятэцы, сацыялагічнай лабараторыі і некаторых іншых. У бліжэйшы час яны паявяцца і тут.

Добрым падспор'ем у нашай рабоце з'яўляецца наглядная агітацыя, куды ўваходзіць афармленне «чырвоных куткоў», «куткоў цвярозасці», стэндаў. У нашым актыве ёсць ужо такія формы, як распрацоўка вучэбных праграм у адпаведнасці з антыалкагольнай тэматыкай. Хораша выказалі сябе ў гэтай рабоце калектывы ДТБЦ біялагічнага факультэта — старшыня М. Р. Кукулянская, юрыдычнага факультэта — старшыня К. А. Барзова, хімічнага факультэта — старшыня П. А. Матусевіч.

З мінулага года ў нас функцыяніруе пастаянны лекторый і кіналекторый. Для актыву ДТБЦ прачытана 8 лекцый з дэманстрацыяй стужак, з удзелам групы лепшых лектараў горада, якія выступаюць на антыалкагольную тэматыку — урачы, нарколагі, юрысты, эканамісты, псіхолагі.

Цікавай і змястоўнай была праведзеная для актыву ДТБЦ навукова-метадычная канферэнцыя «Актуальныя праблемы антыалкагольнай прапаганды», на якой прысутнічалі больш 100 чалавек студэнтаў, прафесарска-выкладчыцкага саставу, «круглы стол», дзе выступіў старшыня гарадскога клуба па арганізацыі вольнага часу Э. Г. Земцаў.

Ідзе актыўны пошук тых форм, якія ў сістэме ВНУ найбольш эфектыўныя. Так, на факультэце журналістыкі члены таварыства арганізавалі пастаянны выпуск радыёгазеты.

Шмат насу заняла ў нас арганізацыя па выданню сваей метадычнай літаратуры. Выйшаў метадычны дапаможнік для студэнтаў «Праўда і крыўда», які яны выкарыстоўваюць пры чытанні лекцый для насельніцтва. Прачытана ўжо больш 700 лекцый.

З ахвотай арганізуюць члены таварыства на факультэтах і ў падраздзяленнях спартыўныя і культурныя мерапрыемствы, тут заслугоўваюць падзякі члены «пярвічкі» фізічнага факультэта, ФПМ, юрфака.

За актыўны ўдзел у рабоце па рэалізацыі планаў па ўкараненню цвярозага ладу жыцця ў калектыве БДУ група нашых актывістаў была прэміравана грашовымі ўзнагароджаннямі па лініі Маскоўскага РК КПБ і падпіскай на часопіс «Цвярозасць і культура»: С. Васільеў, М. Лазовік, А. Сакалова, Л. Ермаловіч, М. Кукулянская, Л. Знак, Н. Ратнікава, А. Гусак і інш.

Леў Талстой лічыў, што найбольш важным у барацьбе з п'янствам з'яўляецца іменна асветніцкая дзейнасць, якая здольна змяніць псіхалогію чалавека. Але, бадай, на самае першае месца ён ставіў уплыў на светапогляд чалавека — аб'яднанне людзей у таварыствы, у саюзы, якія маюць агульную мэту — навучыць жыць і працаваць без спіртнога. 100 гадоў назад прыклад арганізацыі таварыства падаў Л. Талстой, стварыўшы першае ў Расіі таварыства цвярозасці. Ён пісаў: «Трэба імкнуцца выкараніць гэта зло... Галоўнае ў гэтай справе — асабістая ініцыятыва і прыклад. Шлях гэты здаецца мне... самым радыкальным і адзіным».

Г. АЛЯХНОВІЧ,
старшыня добраахвотнага Таварыства барацьбы за цвярозасць.

З ЖЫЦЦЯ Д Т Б Ц

Ты запісаўся ў таварыства цвярэзнікаў?



Госці сабраліся а назначанай гадзіне. Павіншавалі кветкамі, словамі, пацалункамі Яе і Яго. Падняліся на другі паверх прэстыжнага рэстарана. На свята была запрошана адна моладзь.

Расселіся за доўгім сталом. Спачатку было крыху няёмка: шапталіся і пераводзілі позірк то на пачастунак, то на твары насупраць, то на маладых. Побач, у той жа зале, таксама гулялі вяселле. Суседняе свята пачало забіраць больш увагі, бо пачалося яно больш дынамічна, чым тая падзея, дзеля якой сустрэліся. Урэшце, нехта «здагадаўся»: трэба пачынаць.

— Ну, што ж. Вып'ем за здароўе маладых!

Ажывіліся. Загрукалі талеркамі, лыжкамі, відэльцамі. Тосты набіралі хуткасць. Куды і дзявалася скаванасць. Але ненадоўга. Спіртное ўрэшце скончылася і госці выразна глядзелі на маладых.

— Не хвалюйцеся! — падмігнуў, павесялеўшы Ён.— «Гаручага» хопіць!

І мужчыны, вельмі адказна, прытрымліваючыся канспірацыі, перадавалі адзін аднаму пад сталом бутэлькі.

Госці з палёгкай уздыхнулі. Цяпер можна зрабіць і перапынак. Скокі, перакуры, размовы. Здаецца, стала зусім весела. На маладых то забываліся, то, калі яны траплялі на вочы, ціскалі і віншавалі. Хацелася адшукаць самыя лепшыя словы, але яны недзе танулі, і гучалі звычайныя, традыцыйныя выразы. А потым было ўжо ўсё роўна, што гаварыць, што адчуваць.

Прынеслі гарачую страву. Расселіся за сталом зноў. Старшы ўзяў чарку і з таямнічасцю прамовіў:

— А цяпер павіншуем маладых асобна...

У рукі ім пасыпаліся «цаглінкі будучага сямейнага шчасця», як вобразна заўважыў адзін з запрошаных. Нехта, хіхікаючы, расказаў, як на адным вяселлі хтосьці паклаў у канверт рубель, з-за чаго паміж сваякамі двух бакоў пачалася крывавая бойка... Госці дружна рагаталі. Высокі брунет пакрыўджана абурыўся:

— Можаце праверыць: мы з жонкай паклалі 30 рублёў!

Скончылася гарачае, аднастайныя закускі, раскіданыя неапетытна па талерках, цікавасці ўжо не выклікалі. Пілі, не закусваючы, кідаючыся за стол пасля кожнага танца...

Запалілася верхняе святло. Музыканты хавалі інструмент у чахлы. Некаторыя госці паспелі ўцячы «па-англійску». Трэба было збірацца і астатнім. Нявеста совалася паміж крэсламі, збіраючы астаткі ежы ў мяшочак, не забываючыся зліваць і кроплі спіртнога ў чарку, якую пры напаўненні працягвала госцю:

— Ну, за маё здароўе! Не трэба мяне крыўдзіць... Ой, я не вельмі п'яная? — пыталася яна, папраўляючы з'ехаўшыя на галаве штучныя кветкі.

— Ды што ты! Калі ж не напіцца, як не на сваім вяселлі!

Праплыла адміністратар:

— Хопіць! Дахаты шыбуйце. Расселіся... Нявеста ўжо як венік.

Адбылася непрывабная сцэна.

— Якая твая сабачая справа? Што злуеш — табе нічога не пакінем? Усё, усё да кавалачка, да кропелькі забяром — свае грошы табе, дуры, не пакінем.

А што жаніх? Пераблытаўшы стол, ён з нямым здзіўленнем назіраў, як «яго» нявесту цалуе нейкі ў такім жа касцюме, як і ў яго. «Хто ж гэта? — разважаў ён.— Трэба ў морду даць». Але разбору не адбылося, бо ўвагу раптоўна адцягнуў агурок. Жаніх у спробе падчапіць яго нечакана тыркнуў суседку ў далонь. Тая заламантавала і засмяялася. Жаніха падвялі да ўласнага вяселля. Нявесце зрабілася кепска, клапатлівыя сяброўкі звялі яе ўніз — гэта бунтавала трохмесячнае будучае дзіця...

Смешна? Абразліва? На вялікі жаль, многія вяселлі — прыгадайце, паклаўшы руку на сэрца — адбываюцца іменна па такому сцэнарыю. Такім запамінаецца самы святочны, самы яскравы, самы доўгачаканы дзень Яе і Яго. А ці так павінна быць? І хто нясе за адваротнае адказнасць? Ці адна толькі чарка?

Чарка тут ні пры чым. Бо сама па сабе яна не існуе, нязванай госцяй не прыходзіць на свята. Павінны нашы звычаі, калі, каб паказаць гасціннасць, іншыя думаюць, дастаткова накарміць і напаіць «ад пуза». Павінны людзі, якія ў душы пагарджаюць такі разгул, а ўслых крывяць і салодка ўсклікаюць: «Усё выдатна!»

Дзе ж выйсце? Ці можа уступленне ў новае жыццё абысціся без спіртнога?

Не так даўно паявіліся першыя безалкагольныя вяселлі. Іх шырока рэкламавалі, аб іх пісалі і спрачаліся. Толькі нешта зараз не чуваць пра іх...

У нашым універсітэце таксама вядомы безалкагольныя вяселлі, праўда, пакуль іх толькі адзінкі. Гэта пацвердзяць і адказныя за культурна-масавую работу. Нягледзячы на шчырыя абяцанні кафэ «Гаўдэамус» забяспечвае праграмай; ёсць цікавы сцэнарый шлюбнага абраду і, зразумела, выдатныя выканаўцы; прафком прапаноўвае свой падарунак — пакой у інтэрнаце; расходы былі б часткова аплачаны праз універсітэт і г. д., ёсць і «але». Жадаючых, шкада, неверагодна мала.

Спыталася ў тых, хто збіраецца ў хуткім часе спалучыць свае лёсы. Якім вы бачыце Свой дзень?

— Каб было па-чалавечаму: шмат сяброў, вялікі рэстаран, будзем гуляць два дні, можа тры.

— Шмат гасцей запрашаць не будзем. Збяромся можа дома. Пасядзім...

— Паедзем да маёй нявесты ў вёску. Мне падабаюцца вяселлі там.

— Хачу, каб да нас прыйшла ўся група. На другі дзень паедзем «на прыроду».

— Не хачу традыцыйнага вяселля. На грошы, якія падораць бацькі, лепш паедзем у шлюбнае падарожжа.

— І мы не жадаем звычайнага застолля. А вось як зрабіць так, каб запомнілася надоўга — яшчэ не ведаем.

Меркаванні, як бачыце, розныя і нават супярэчлівыя ў сваёй аснове. Тыя, хто адмаўляецца ад свята, маюць на ўвазе адмоўныя адносіны да звыклага застолля, дзе маладым адводзіцца сумная роля ўлагоджваць страўнік і, прабачце за выраз, горла запрошаных. Частка маладых людзей з пагардай ставіцца да алкагольнага вяселля. Аднак не бачыць адзінае выйсце ў тым, што, каб зрабіць сапраўднае свята, трэба толькі напоўніць бакалы сокам і кампотам.

Адно ясна. Чарка губляе сваю сілу, як падстава добрага настрою, абавязковы атрыбут вяселля.

І ці быць ёй сведкай адзіну дзён сумеснага жыцця будучай сям'і, у вялікай ступені залежыць не толькі ад жадання маладых, а ад нашай свядомасці, нашай культуры — тых, каго запросяць Яна і Ен на сваё свята, Свой дзень.

А. ВІХРОВА.

МЕРКАВАННЕ

Навошта вяселлю горыч?

САТЫРЫЧНЫМ ПЯРОМ

«Здароў, братка Сцяпан!»

«УЧОРА пілі за нашу вёску і здароўе родных. Памятаеш, як добра мы некалі седжвалі з табой і гарэлкі было — залейся. Зараз ужо не тое. Ты парагочаш з гэтых маіх скаргаў, я ж цябе ведаю. Самагон у цябе ніколі не пераводзіўся. А мне не да смеху. Сон страціў у апошні час, ёсць прычыны.

Ты ведаеш, я ва універсітэце працую даўно. Знаёмых у мяне шмат. Не з адным у свой час перапіў. Дык вось. Нядаўна паказвалі мне ліст. Атрымліваецца, не толькі мяне аднаго кідае ў дрыжыкі ад слова медвыцвярэзнік. Ведаюць пра гэта і выкладчык І. П. Галай, і вадзіцель А. П. Графаў. Шкада, што з імі не знаюся. А наогул, па гэтай паперцы выходзіць, у мінулым годзе затрымана 26 супрацоўнікаў універсітэта і 19 студэнтаў. Шасцёра далі падставу для новай паперкі і ў гэтым годзе. Палічы, гэта ж — сіла! Сабяры такіх разам — горы звернуць.

Я неяк сон цікавы бачыў. Быццам знаходжуся ў вялікай зале, а міма праходзяць на свой сход усе «пакрыўджаныя» міліцыяй. У кожнага своеасаблівы білет, у якім прозвішча і пералік «заслуг». Хаджу я, чытаю. Не паверыш, так цікава! Скажам: «А. З. Нікалаеня, дацэнт факультэта радыёфізікі і электронікі. 2.10.1987 года дастаўлены п'яным у медвыцвярэзнік. Атрымаў строгую вымову, пазбаўлены ўсіх відаў прэмій, перанесена чарга на атрыманне кватэры». Або І. П. Галай, выкладчык геаграфічнага факультэта: «14.11.1987 года ў п'яным стане знаходзіўся на вуліцы Сядых. Сярэдняя ступень ап'янення. Быў змешчаны ў медвыцвярэзнік. Заслухоўваўся на партсходзе. Вызвалілі ад абавязкаў намесніка дэкана. Сход вынес строгае папярэджанне з занясеннем ва ўліковую картку». А пра студэнтаў і казаць няма чаго. Дакладней, наадварот. Так і мільгаюць характарыстыкі з міліцыі. «Знаходзіўся ў п'яным стане, у навакольным асяроддзі не арыентаваўся» (А. Пастухоў, III курс, юрфак). «Учыніў бойку. Перашкаджаў акружаючым» (В. Радзюшкевіч, III курс, фізфак).

Як заўсёды, такі салідны сход не абышоўся без гасцей — замежных студэнтаў. Некаторыя з іх з ахвотай дзяліліся сваім вопытам. І было чым. Буйунга Абубакер, журфак: «У п'яным стане кідаў мэблю. Біў посуд, біўся». Ці Джон Качалан, журфак — «у п'яным стане 8.01.1988 года працягваў даводзіць сябе да «кандыцыі». Так што, братка Сцяпан, «ганарыцца» у нас, ва універсітэце, ёсць чым. І як у любой іншай справе, вылучаюцца тут свае лідэры. Па колькасці парушэнняў АХЧ трывала займае першае месца (міліцыяй затрымана ў мінулым годзе 12 чалавек). Сярод студэнтаў па колькасці парушэнняў на «прызавыя» месцы выйшлі журфак (4) і фізфак (3). Але, як бачыш сам, гэта адны з самых няўдачлівых з нас. Мне пакуль шанцуе. Хоць, як ужо пісаў, усё цяжэй з кожным днём жыць па старой звычцы. Сплю дрэнна. Думаю пераехаць да цябе. Хоць разумею, што і там не цукар. Дзе зараз нашаму брату лёгка без цукру? Так што можа скора і сустрэнемся. Бывай здровы!

Твой Мікола.

P. S. Ледзь не забыўся. На гэтым тыдні пахавалі Ягора. Павінен памятаць яго. Улетку прыязджалі да цябе. Абпіўся самагонам. Дурань.

21 сакавіка 1988 года.»

Запісаў за Міколу
А. МАКСІМАЎ.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
24 сакавіка
Зак. 1615.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.